25 сакавіка ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў ТЦСАН прайшла літаратурная гадзіна “Пісьменнікі роднага краю”. У мерапрыемстве прымалі ўдзел бібліятэкар Раіса Гракава і кіраўнік літаратурна-музычнага аб’яднання “Світанак” Ала Міхайлава. Ала Міхайлава расказала пра гісторыю стварэння народнага літаратурна-музычнага аб’яднання “Світанак”, творчасці і дасягненнях яго ўдзельнікаў. Дзякуючы творчай працы мясцовых паэтаў і пісьменнікаў, выдадзена шмат кніг, у якіх услаўляецца гісторыя і непаўторнасць Шаркаўшчынскага краю. На сустрэчы гучалі творы М.Кукуця, В.Лагуна, К.Сосна, А. Міхайлавай. Цікава было даведацца пра жыцце і творчасць пісьменніка В. Праўдзіна, які нарадзіўся ў нашым раёне і многія свае творы прысвяціў землякам, родным мясцінам. Адбылася змястоўная гутарка об тым, што кніга з’яўляецца цудоўнай крыніцай ведаў, а чытанне садзейнічае ўмацаванню здароўя, змястоўнаму і карыснаму правядзенню вольнага часу.

